А еще у Евгении Александровны было увлечение: выбрать портрет понравившегося ей писателя, отыскать значки с его изображением или вырезать из журнала репродукцию портрета или известной картины по произведению, найти нужное изображение на почтовой открытке, соответствующую ей почтовую марку и все это разместить за стеклом книжных стеллажей у себя в кабинете. Получалась своеобразная выставка, которой она любовалась. Было желание сделать выставку двух белорусских классиков – Янки Купалы и Якуба Коласа.

Даже только прикасаясь к жизни и творчеству Е. А. Таратуты, четко понимаешь: чем богаче духовный мир отдельного человека, тем сильнее ощущается потребость приобщиться к культурным ценностям целого поколения.

Существуют внутренние тенденции развития истории культуры и ее стадий. Чтобы увидеть важнейшие этапы этого процесса, его диалектику, следует рассматривать роль литературы в духовной культуре людей и ее функционирование в исторически подвижном контексте.

***Г. М. Друк,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

## ІДЭЯ ХРЫСЦІЯНСКАЙ СВЯДОМАСЦІ Ў РАМАНЕ В. КОЎТУН «ПАКЛІКАНЫЯ»

Раман «Пакліканыя» В. Коўтун можна ахарактарызаваць як маштабны па задуме твор, што вылучаецца складанасцю сюжэтна-кампазіцыйнага выражэння і багаццем ідэйнага зместу. Але ідэя хрысціянскай свядомасці загучала ў рамане дамінантна, выявілася ў пастаноўцы праблемы паклікання і знайшла арыгінальнае мастацкае вырашэнне. Галоўным чынам, праз распрацоўку цэнтральнага вобраза незвычайнай для ўсяго свету жанчыны, першай святой на ўсходнеславянскіх землях – Еўфрасінні Полацкай, а таксама сістэмы вобразаў персанажаў, рэальных і выдуманых, якія ў яе лёсе і ў той час маглі адыграць сваю вызначальную ролю. Шматбакова пададзена ў тво-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры пакліканне – пытанне складанае, якое мае нават выразны трансцэндэнтны характар.

Відаць, нараджэнне чалавека ёсць магчымасць Божага паклікання. Момант з'яўлення на свет дачкі князя Святаслава-Георгія Прадславы напоўнены містычна-рэлігійным гучаннем. На думку язычніцкага вешчуна Вікулы, паганы цмок, ці д'ябал, чуткамі аб прыходзе якога жыве Полаччына, шукае сярод крывіцкага люду нейкае незвычайнае нованароджанае дзіця. Як пабачым, Прадслава пасля нараджэння прыме жыццё ва ўсіх яго праявах, але найбольшую цікавасць з маленства выкажа да кніг і вучобы. Яна паказана самай лепшай з усіх герояў – вучняў школы пісца Данілы, паслядоўніцай у справе ўмацавання хрысціянскіх каштоўнасцей, якія шчыра ўспрыняла падчас навучання. Чытанне і перапісванне кніг – адзін з вызначальных фактараў у фарміраванні яе характару і светапогляду, які меў сваю дынаміку ўплыву. Ад звычайнага захаплення Словам («Кніжкі як сонейка ўдзень. Як месяц уначы»* [с. 32]) праз любоў да ведаў і Бога («Кніжкі – гэта Гасподзь, які ёсць Слова» [с. 32]) паступова фарміравалася здольнасць глыбока аналізаваць з'явы рэчаіснасці, узнікла жаданне «разгадаць блізкае і далёкае», «разгледзець запаветнае» [с. 154]. Душэўна, нават апантана аддаючы сябе кніжнай справе, яна падрыхтавала месца для прысутнасці Бога ў сваім сэрцы, а праз тое паступова выкіроўвала на шлях свайго галоўнага паклікання.

Сватанне паказана ў творы пераломным, псіхалагічна-драматычным момантам біяграфіі гераіні, які яе хвалюе з прычыны таго, што ў «нейкім невядомым чужым краі, можа, няма ні пергаменаў, ні найкаштоўнейшых, з Царгорада прысланых, кніжак» [с. 29], у выніку чаго яна «нечакана заняпала». Відавочна, што толькі ў працэсе напружаных духоўных пошукаў Прадслава змагла б адчуць, распазнаць і адгукнуцца на голас паклікання, што прадстаўлены ў яе першым відзежы сістэмай мастацкіх дэталяў і вобразаў – жураўлінага кліча «коўрлы», «зорнага неба», «крылаў», «палёту», «крыжа», «дарогі» і «густой і важкай крыві», якая капала, здавалася гераіні, з самога неба. Выразная сімвалічнасць выкарыстаных аўтарам вобразаў сведчыць пра драматычны жыццёвы шлях, які патрабуе ад асо-

* Цыт. па: *Коўтун, В*. Пакліканыя: раман-жыццё / Валянціна Коўтун. – Мінск : Мастац. літ., 2007. – 247 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бы вырашэння няпростых задач, пастаноўкі высокіх мэт, а таксама ахвярных высілкаў для іх рэалізацыі. Пачуты Прадславай голас быў як імпульс, што накіраваў яе да прысвячэння Богу свайго жыцця, яго свядомага і самастойнага праектавання ў святле веры. Такі выбар засведчыў здольнасць гераіні да духоўнага развіцця, гэта мы і ўбачым, прааналізаваўшы, напрыклад, сюжэт або нават таленавіта выпісаныя вобразы-відзежы гераіні на працягу ўсяго рамана. Яны нясуць важную нагрузку ў раскрыцці вобраза асветніцы, яе сталення, выспявання дару звышуяўлення, прароцтва і лекарства.

На новым этапе жыцця, калі быў прыняты пострыг, гераіня, канешне, ускладае на сябе адказнасць перад Богам за чысціню ўласнага духоўнага жыцця і абавязкі па аздараўленні сацыяльна-грамадскага асяроддзя, бо страшней за рэальную чуму паўсюль распаўзлася «іншая чума, цемра чалавечая» [с. 104]. У рамане паказана складанасць палітычнага жыцця пачатку XII ст.: ідзе пастаянная барацьба паміж князямі-зроднікамі за прастол, знешні вораг скарыстоўвае гэты момант дзеля ўласных інтарэсаў. Сітуацыю ўскладняюць няпростыя стасункі ў сферы рэлігійнага жыцця: непаразуменні паміж язычнікамі і тымі, хто ўжо вызнае хрысціянскую веру, адбываюцца дастаткова часта (сюжэтная лінія закаханай у язычніка Валодшу менскай князёўны Вольгі, эпізоды пра забойства ігумена Бельчыцкага манастыра, смерць вешчуна Вікулы, паганскія гулянні). Адным з самых яркіх прыкладаў «чумы» ў якасці сімвала з’яўляецца запалоцкі князь Барыслаў, для якога не існуе ніякіх маральных законаў. Актыўная духоўна-грамадская праца Еўфрасінні вядзецца паводле закліку Анёла: «І ўціхамірвай люд свой, і не дай кроплям крыві ракою стаць» [с. 70].

Жыццё і дзейнасць Еўфрасінні сведчыць пра асаблівасць хрысціянскага паклікання, яго гераічны характар. І не толькі таму, што ёй, жанчыне, даводзілася, па задуме аўтара, выбаўляцца часам з фізічна невырашальных сітуацый. Асцярожна карыстаючыся элементамі прыгодніцка-дэтэктыўнага жанру, аўтар стварыла такія эпізоды, у якіх гераіні, здаецца, канчаткова пагражае смерць (яе маглі ахвяраваць агню на капішчы, выкрадалі таці хана Баняка, намагаліся выманіць і згвалтаваць, спрабавалі атруціць і інш.). Вікула таму і не паверыў у сваю здагадку пра сакральнасць нараджэння для свету жывых дачкі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

полацкага князя, бо інтуіцыю перамог стэрэатып мыслення: «Што можа слабасілая жаночая плоць?». Еўфрасіння прымае часам радыкальныя меры: носіць валасяніцу, каб стаць, да прыкладу, «чужой свайму характву», якому пакланяліся, паводле задумы аўтара, смаленскія князі Дабраслаў і Барыслаў, кмет Сава, язычнік Валодша. На працягу ўсяго рамана моманты яе змагання з д’яблам, яго прымарамі – гэта жаданне поўнасцю адрачыся ад розных спакусаў плоці. Не меншым выпрабаваннем для яе робіцца пакаранне полацкіх князёў, у тым ліку і бацькоў, выгнаннем з роднай зямлі. І нарэшце, гераічны подзвіг апекі цэлага народа. Пройдзены Еўфрасінняй жыццёвы шлях добра адчула і выявіла мастачка Вольга ў дзвюх такіх розных фрэсках: на адной яе вочы «прагныя да жыцця і зямных спраў», на другой у іх «непазбыўны боль» [с. 193].

Рэалізацыя шматбаковага, па сутнасці, паклікання магчыма праз выкананне аднаго з важных, на думку ігуменні, запаветаў: «Сказана: прыйдзі да сябе і прыйдзеш да Айца нябеснага» [с. 121]. Гэтыя словы паўторам адрасуе яна князю Мсціславу Манамаху, настойліва нагадваючы пра мірныя, хрысціянскія паводзіны. Праз выпрацоўку волі, крышталізацыю сумлення і праяўленне міласэрнасці Еўфрасіння ўзбагачае сваю сілу духу. Паняцце любові як фундаментальнай катэгорыі не толькі рэлігійнага быцця, але і сацыяльнага ладу становіцца вызначальным у жыцці, прыклад якога падае́ Еўфрасіння. Яна корміць галодных і хворых на чуму, абараняе дзяцей-сірот, уціхамірвае ваяўнічых князёў, давярае справы тым, каго іншыя выракаюцца. Адпаведна хрысціянскаму вучэнню, застаецца міласэрнай да даведзенага ўласнымі грахамі да поўнага адчаю Барыслава. Любоў да чалавека стала неад’емнай ад любові да Бога сутнасцю яе жыцця, яна паяднала гераіню глыбокай сувяззю з грамадскай супольнасцю. Відаць, не толькі дзеля займальнасці ўводзіць пісьменніца ў сюжэт рамана вобраз яўна-прывіднага біярмійскага скарбу. У святле маральных каштоўнасцей антытэзай яму паўстае скарб сапраўдны – любоў.

Згодна з Бібліяй, чалавек прызваны выяўляць вобраз Бога і пераўтвараць жыццё паводле хрысціянскіх запаветаў. З гэтай тэзы вынікае, што пакліканне дадзена ўсім людзям, што і паказана ў рамане. Гераіня вяшчае словамі Пісання: «Той, хто хоча ісці за Мной, няхай адлучыць сябе ад іншага, возьме свой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крыж і кожны дзень ідзе» [с. 79]. Акрамя Прадславы-Еўфрасінні, вучацца міласэрнасці, набываюць вопыт веры іншыя героі, кожны з якіх ідзе да Бога сваім поўным драматызму шляхам. Паводзінам некаторых з іх можна адшукаць адпаведныя парадыгмы ў біблейскай гісторыі. Вольга прыйдзе пасля таго, як гвалтоўна «пахрысціць» язычнікаў у лесе за здраду ёй вешчуна Валодшы. Надзвычай доўгі час спрабуе прымірыць у сабе «Звеніславу» і «Тэрэзу» Еўпраксія, якая да таго ж «у сваім воку бервяна не бачыць» (асуджае за блудніцтва не сябе, а Куліну і двойчы робіць спробу забіць яе маленькую дачку). Цяжка перажывае страту жонкі-прыгажуні Міхал. Але паздрадніцку выракаецца яе, не прызнаючыся Кірыку, што ведае ўладальніцу пярсцёнка – сваю Веранію, якая такім спосабам прасіла каханага аб выратаванні з няволі. Кірыка цяжар жыццёвых абставінаў асуджае на абылганне, вечнае бадзянне і не прыводзіць, як Міхала, у манастыр. Але ён бярэ пасільны ўдзел, адпаведна абставінам, у абароне каштоўнасцей – жыцця, праўды, справядлівасці.

Прастора мастацкага выяўлення праблемы паклікання, абранасці пашыраецца, калі аўтар дае цэнтральнай гераіні твора магчымасць у выніку разважанняў над працай кніжнікаў, дойліда Іаана, Лазара Богшы, юнай мастачкі Вольгі зрабіць высновы пра талент: «А сіла ўся – у тых, хто валодае жыццём праўдзівым, пахамі-колерамі, словамі яго, мыслямі чалавечымі. Над часам, што ляціць, нас усіх у яміну сызпеклую цягнучы, уладу яны маюць. Бо ў леты глыбокія зазіраюць. І там застаюцца. Такая сіла ім дадзена» [с. 199]. Фізічнае вынішчэнне «пакліканых Спасам» стваральнікаў культуры можа прывесці да трагічнай сітуацыі: «…які помарак вакол у жыцці, якое запусценне, якое аскудзенне. І ўсе ўратаваныя ісціны Боскія нібыта абкрадзены» [с. 122]. Таму як адзін з запаветаў вялікай падзвіжніцы могуць прагучаць такія радкі: «Прыйдзі ў сябе, чалавеча. Уваскрасі хоць у думках годнасць і веліч сваю» [с. 122].

Такім чынам, пакліканне – справа жыцця кожнага з людзей. Праблема толькі ў тым, што сабой уяўляе сам чалавек, якія ў яго схільнасці, здольнасці, якія высілкі яму трэба прыкласці і колькі часу спатрэбіцца, каб дасягнуць найвышэйшага ўзроўню развіцця асобы, навучыцца любіць не толькі родных і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сяброў, але і чалавецтва, як любіць усіх Хрыстос. Паводле зместу рамана, умацаванне чалавекам духоўнасці магчыма найперш праз сферу адукацыі і культуры. Пакліканыя выхоўваць маральна і эстэтычна, яны перадаюць наступным пакаленням сэнс чалавечага і грамадскага развіцця ў гісторыі.

***І. Б. Лапцёнак,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ІНДЫВІДУАЛЬНА-ТВОРЧЫЯ ФОРМЫ ВЫЯЎЛЕННЯ ІДЭЙНА-МАСТАЦКІХ ПОШУКАЎ ПІСЬМЕННІКАЎ У ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Перыяд Вялікай Айчыннай вайны быў часам трагедыйнай рамантычнасці і разам з тым поўным глыбокай веры ў жыццё, будучыню, перамогу, што надавала творам ваенных гадоў своеасаблівую героіка-эпічную афарбоўку. У творах тых часоў пераважаюць дзве мастацкія тэндэнцыі. Адна з іх звязана з паказам падзей у «жыццепадобнай» форме, «на бытавой аснове». Гэтыя творы адрозніваюцца мастацкай дакладнасцю, аб'ектыўнасцю апавядання, выяўленнем малюнкаў паўсядзённага побыту вайны. Другая тэндэнцыя – адлюстраванне паказу вайны з цягай да сімволікі, на аснове інтэнсіўнага лірыка-рамантычнага пачатку.

Асаблівую актуальнасць прадстаўляюць індывідуальна-творчыя формы выяўлення ідэйна-мастацкіх пошукаў пісьменнікаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, звязаныя з іх асабістым лёсам і светаўспрыманнем.

У ваенныя гады вядомыя пісьменнікі былі карэспандэнтамі франтавых і цэнтральных газет. Многія прадстаўнікі літаратурнай супольнасці з'яўляліся не проста сведкамі падзей ваеннага ліхалецця, але і іх непасрэднымі ўдзельнікамі, на сабе адчулі ўсе нягоды франтавога жыцця: «Это были люди, которые все тяготы войны вынесли на своих плечах – от начала её и до конца. Это были люди окопов, солдаты и офицеры; они сами ходили в атаки, до бешеного и яростного азарта стреляли по танкам, молча хоронили своих друзей, брали высотки, казав-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ